ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
14
СНЕЖНЯ
№ 34(1627)

ІНФОРМБЮРО

ПАРАІМСЯ?

Перш чым спыніць свой выбар на тым ці іншым кандыдаце ў дэпутаты ў Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы, назапасіць для яго шэраг наказаў і прапаноў, ці ў горшым выпадку, падымаць гвалт у сувязі з «правалам» вашага абранніка на выбарах, звярніцеся ў кансультацыйна-прававы цэнтр. Ён пачаў сваю работу 11 снежня. Працуе кожны дзень, акрамя суботы і нядзелі з 12.00 да 18.00 гадзін на вуліцы Маскоўскай, 17 у камітэце камсамола юрфака (тэлефон 25-36-19). Парады даюцца бясплатна.

НЕ ПРАМІНІЦЕ! • ШТО НОВАГА? • ШТО НОВАГА? • ШТО НОВАГА? • ШТО НОВАГА? •

ЁСЦЬ ІДЭЯ!

Мільёнаў за ідэю яны не атрымліваюць, нават капейкі са сваіх бясконцых пошукаў і прапаноў не маюць, але працуюць з надзвычайным натхненнем, стараннасцю і зацікаўленасцю. Хто ж яны, гэтыя дзівакі? Адкуль і дзе ўзяліся ў наш прагматычны век? І чаго яны ў рэшце рэшт хочуць ад жыцця?

— Не адставаць ад грамадскіх і палітычных падзей у краіне, разабрацца ў шматлікіх недарэчнасцях нашай эканомікі, выбраць правільную пазіцыю ў час плюралізму думак і поглядаў,— словам, ісці наперад,— адкажа вам любы член студэнцкага інфармацыйна-прапагандысцкага цэнтра юрыдычнага факультэта. Дарэчы, і назва нашага цэнтра адмысловая — «Наперад». Проста і зразумела. Існуе наша «бюро» другі год пад нязменным кіраўніцтвам дацэнта кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, кандыдата гістарычных навук Лідзіі Паўлаўны Максімавай. За гэты час мы арганізавалі шмат дыскусій, сустрэч з цікавымі і кампетэнтнымі людзьмі, стварылі насценную газету. Для атрымання звання «маладыя палітыкі» у нас пакуль малавата ведаў, жыццёвай мудрасці. Таму ўсе дыскусіі і сустрэчы з'яўляюцца для нас палітычнай вучобай, умацаваннем светапогляду. Зрэшты, гэта не перашкаджала нам горача спрачацца і з першым сакратаром ЦК ЛКСМБ Уладзімірам Кудлашам, і з пісьменнікам Мікалаем Чаргінцом, якія таксама былі нашымі гасцямі.

Зараз з нецярпеннем рыхтуемся да 16 снежня. Сумесна з камітэтам камсамола універсітэта мы арганізоўваем сустрэчу з Мітрапалітам Мінскім і Гродзенскім, Патрыяршым экзархам Беларусі Філарэтам. Сустрэча адбудзецца ў актавай зале галоўнага корпуса а 12-й гадзіне.

І. АЛЕКСАНДРОВІЧ,
сакратар камітэта
камсамола юрфака.



ГУТАРКІ З НАГОДЫ...

... ПРЫЁМУ Ў ВУНДЭРКІНДЫ



Фотакалаж С. ГРЫЦА.

Ох і цяжкая ж ты, шапка вундэркінда! Не толькі насіць — надзець нялёгка. Яскравае сведчанне таму — уступныя экзамены ў спецыялізаваную школу, адкрытую пры універсітэце. З 360 прэтэндэнтаў тытул вундэркінда афіцыйна зацверджаны для 200. Жартачкі вам конкурс у чатыры чалавекі на месца на філалагічным аддзяленні?! Магчыма, і ў выкладчыкаў, і ў дырэктара школы Аляксандра Іванавіча Жука ўжо з'явіліся «любімчыкі»?

— Не,— запэўніў нас Аляксандр Іванавіч,— хоць ёсць шмат таленавітых хлопчыкаў і дзяўчынак. Уявіце сабе, Саша Радзько — прызёр Рэспубліканскай фізіка-матэматычнай алімпіяды, а ў час уступных пісьмовых экзаменаў паспеў выканаць не толькі свой варыянт, але і ўсе астатнія. А Дзіма Патыка, Інга Вараб'ёва? Зарэкамендавалі сябе добрымі знаўцамі рускай філалогіі.

— На жаль, цяга да роднай мовы ў школьнікаў пакуль невялікая. Толькі 40 са 120 паступаўшых на філалагічнае аддзяленне аддавалі перавагу беларускай мове. Але, слухаючы іх, атрымліваеш вялікае задавальненне. Мова чыстая, прыгожая, каларытная.

Нялёгкая ты, шапка вундэркінда. Нават, калі цябе няма. Праўда, не ўсё яшчэ страчана. Прыём у вундэркінды працягнецца праз год. А ў шчасліўчыкаў зараз свята, будні пачнуцца пасля школьных зімовых канікулаў.

М. ЛІЦВІН.

НА ЗДЫМКУ: ідуць уступныя экзамены.

ІНФОРМБЮРО

«ПАРТЫЯ І ПЕРАБУДОВА»

Перабудова нашага грамадства, якая пачалася па ініцыятыве КПСС, сустрэла на сваім шляху шмат цяжкасцей і перашкод. Савецкія людзі разумеюць, што надзеі на яе поспех цесна звязаны з палітыкай партыі. Адсутнасць радыкальных дэмакратычных перамен у самой партыі хвалюе сёння не толькі камуністаў, але і беспартыйных. Таму пошук адзіна правільных рашэнняў многіх партыйных праблем павінен весціся без размежавання на прыналежнасць да партыі.

Партыйны камітэт універсітэта запрашае прыняць удзел у дыскусіі «Партыя і перабудова». Для абмеркавання прапануюцца наступныя пытанні:

— шляхі ўмацавання аўтарытэту партыі — барацьба за давер народа, узмацненне адказнасці перад ім. Якім чынам партыя можа цвёрда стаць на гэты шлях? Вашы адносіны да 6-га артыкула Канстытуцыі СССР;

— як Вы разумееце ролю КПСС у якасці палітычнага авангарду грамадства?

— дэмакратызацыя грамадскага жыцця краіны пераганяе аналагічны працэс у партыі. Якія вашы прапановы па развіццю ўнутрыпартыйнай дэмакратыі?

— Вашы прапановы па змяненню Статута КПСС;

— якія сродкі неабходна прывесці ў дзеянне сёння, каб павысіць ролю пярвічнай партыйнай арганізацыі, партгрупы?

— якім Вам уяўляецца шлях павышэння аўтарытэту, ролі і адказнасці кожнага члена КПСС?

Дыскусія адбудзецца 20 снежня ў актавай зале галоўнага корпуса. Пачатак а 16-й гадзіне.

ПАРТКОМ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

...перарэгістрацыі

— Ну, скажы, навошта ты зноў у камсамол запісаўся? — праводзіў «антыагітацыю» Ігар Грамыка. Чарговы «перарэгістраваны» паціскаў плячыма і моўчкі выходзіў з пакоя.

Гаворыць сакратар камітэта камсамола факультэта Света Грузневіч:

— Думалі, што перарэгістрацыя дапаможа аддзяліць «зерне ад плевела», дазволіць выпадковым людзям спакойна выйсці з Саюза моладзі, а застануцца самыя стойкія і перакананыя камсамольцы, з якімі можна любую справу зрабіць. Аднак, «стойкіх» за два тыдні набралася 102 чалавекі з 786. Астатнія проста не звярнулі ўвагі на перарэгістрацыю. Што з імі рабіць? Выключаць? Магчыма, так і будзе. За гэты тыдзень раздадзім па камсамольскіх групах карткі ўліку, а потым ужо будзем аўтаматычна выключаць «няўлічаных».

— А што рабіць тым, хто не паспее запісацца ў «новы» камсамол?

С. ГРУЗНЕВІЧ:

— Нічога страшнага не здарыцца. Калі прычына досыць уважлівая, можна для кагосьці зрабіць выключэнне. Але такіх людзей набярэцца адзін — два — не больш. У нас зараз іншая праблема. Што рабіць далей? Мы нічога не можам прапанаваць «новым» камсамольцам.

І. ГРАМЫКА: Без падтрымкі «знізу» ні адна ідэя, нават самая дробная, не ажыццявіцца. Таму мэтазгодна было б замест перарэгістрацыі распусціць камсамольскую арганізацыю факультэта. А замест яе стварыць клубы і гурткі па інтарэсах. Сёння ў камсамоле ў нас застаюцца тыя, хто палохаецца, як бы чаго не выйшла пасля выхаду з гэтай арганізацыі, ці проста кар'ерысты. Трэція — па-за «саюзам».

М. МАСТОЎСКІ.

НА МІНУЛЫМ ТЫДНІ

ТАВАР ТВАРАМ

«Кнігі — сябры»,— сказаў паэт. Лёгка знайсці сябра на прыгожай вітрыне ці на акуратных паліцах, але як адшукаць яго ў агромістым сховішчы. Каталог, безумоўна, надзейны памочнік, толькі ж занадта занудлівы, нецікавы, ды і, прызнацца, не ўсе мы ўмеем ім карыстацца. Таму і пакутуем, бывае, ад недахопу патрэбнай кнігі, нават не ведаючы, што яна тут, побач, у знаёмай зале універсітэцкай бібліятэкі. Вось і вырашылі супрацоўнікі бібліятэкі (у прыватнасці, аддзелаў кнігазахоўвання, вучэбнай, навуковай і мастацкай літаратуры, а таксама аддзела даведачна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай работы) зрабіць крок насустрач сваім чытачам — у фае бібліятэкі сумесна з універсітэцкай кафедрай педагогікі арганізаваць выстаўку педагагічнай літаратуры. Тут было прадстаўлена каля чатырохсот кніжных экспанатаў, многія з іх упершыню ўбачылі не толькі студэнты, але і выкладчыкі кафедры педагогікі. Напярэдадні адкрыцця выставы супрацоўнік кафедры педагогікі А. А. КАНАВАЛЬЧЫК правяла агляд кніжных навінак. Гэта дало магчымасць наведвальнікам лепш арыентавацца ў шматтомным моры літаратуры. Трыццаць

восем кніг у першы ж дзень знайшлі свайго чытача, а ўсяго выстаўку наведала больш за 120 чалавек.

Гэтая мізэрная лічба яскрава сведчыць аб слабай папулярнасці кніжных выстаў ва універсітэце. Вядома, выстаўкі-продажы сучаснага адзення карыстаюцца большым поспехам у студэнтаў. І ўсё ж патрэба ў «духоўных» выставах не меншая — яны таксама паказваюць тавар тварам.

І. АРЭХОЎСКАЯ,
дырэктар бібліятэкі.

ШТО НОВАГА? • ШТО НОВАГА? • ШТО НОВАГА? • ШТО НОВАГА? •

ПРАГНОЗ НА ЗАЎТРА

Далоў кабінетную цішу!

У пятніцу, 1 снежня «сліўкі» універсітэцкага камсамола вырашылі пакінуць свае апартаменты. Для свабоднай размовы — на свабоду, далей ад гарадскога шуму і трэцяга паверха галоўнага корпуса. Месцам сустрэчы выбралі Мінскі маладзёжны цэнтр «Юнацтва». Нетрадыцыйны пачатак размовы прадвызначаў захапляючы працяг.

Уявіце сабе, што ўдзельнікі семінара абменьваліся навінамі не ў перапынках паміж адказнымі пасяджэннямі, а вечарам на дыскатэцы, у вольнай абстаноўцы, дзе які-небудзь Сідараў — звычайны чалавек, а не намеснік сакратара па ідэалогіі. А пры нашым дэфіцыце зносін факт гэты з'яўляецца нечым неардынарным, гістарычна каштоўным. Не патрэбна, высунуўшы язык, бегчы на пасяджэнне з другога канца горада, праклінаючы грамадскую нагрузку. Усе побач, усе разам, настроены на работу. І работа не прымусіла сябе доўга чакаць. У суботу мазгавы цэнтр камсамольскай арганізацыі універсітэта прыняўся за вырашэнне надзвычай сур'ёзных праблем студэнцкага жыцця.

«Да адказу — адміністрацыю!»

Вядома, што любая праблема пачынаецца з адносін да яе, і каб не стварыць мноства нявырашаных сітуацый, неабходна штодзённая, карпатлівая праца, якая патрабуе энтузіястаў, рамантыкаў, дзелавых людзей. Здаецца, менавіта такія людзі сабраліся на сустрэчы з прадстаўнікамі адміністрацыі універсітэта: прарэктарам Пятром Іванавічам Брыгадзіным і намеснікам сакратара парткома па арганізацыйнай рабоце Верай Акімаўнай Прокашавай. Прыехалі сюды дзяўчаты і хлопцы зусім не з пустымі рукамі.

Вечара пытанняў і адказаў не атрымалася; ішла дзелавая размова людзей, аб'яднаных агульнай мэтай. Каменем сутыкнення для многіх арыгінальных ідэй быў і застаецца нездавальняючы стан матэрыяльнай базы універсітэта. Пакуль «ратуюцца» скарачэннем прыёму студэнтаў на будучы год. Што рабіць — капітальнага рамонту патрабуюць шматлікія аварыйныя памяшканні.

Кола абмяркоўваемых пытанняў было даволі шырокім, пачынаючы з сельскагаспадарчых работ і заканчваючы магчымасцю стварэння пры біяфаку аграфірмы або ідэяй вытворчасці духоў студэнтамі-хімікамі.

Што ж, радыкальнаму камсамольскаму руху адкрылі «зялёную вуліцу». Такі паварот спраў, бясспрэчна, дае перспектывы. А пакуль патрэбна ідэя, вакол якой неабходна згуртавацца, ідэя авангардная, што патрабуе энергіі і энтузіязму камсамола, разважлівасці і вопыту партыі.

Выйсце з тупіка?

Самым «цытуемым чалавекам дня» можна назваць Ігара Велічанскага — прэзідэнта дыскусійнага клуба «Палітыкус». Доўга яшчэ студэнты ў час спрэчак прыводзілі вытрымкі з яго выступлення.

Расказваць пра «круглы стол» — усё роўна, што шукаць іголку ў стозе сена. Толькі тыя, хто прысутнічаў тут, змаглі ўявіць перспектывы і разгледзець цёмныя старонкі мінулага камсамола.

Шмат добрых слоў было сказана Велічанскім у адрас БДУ. На яго думку, гэта адна з нямногіх ВНУ рэспублікі, што ўзяла курс на аўтаномію.

Паўсюдная пасіўнасць, апатыя змяняюцца ўзрастаннем цікавасці да спраў грамадскасці, жаданнем унесці сваю долю ў агульны кацёл.

Ідэалогія наконт выразу «вышэй даху не скочыш» становіцца гістарычнай рэліквіяй.

Пакуль дакладна адно: камсамол яшчэ не выражае поўнага плюралізму маладзёжных арганізацый і таму Велічанскі гаворыць аб неабходнасці стварэння камітэта маладзёжных арганізацый БССР, у якім бы свабодна функцыяніравалі фракцыі (рабочай моладзі, навучэнцаў, нефармалаў).

«Палітызацыя ці эканамізацыя?»

Юрфакаўцы спрачаліся, пераконвалі, прапаноўвалі. Страсці накаліліся да такой ступені, што патрэбна было працягваць дыскусію, каб не вырваліся эмоцыі.

Дык што ж: палітызацыя ці эканамізацыя камсамола?

Ігар АЛЕКСАНДРОВІЧ, сакратар камітэта камсамола юрыдычнага факультэта:

— Галоўнае — палітызацыя. Калі камсамол будзе магутнай палітычнай арганізацыяй, ён зможа стварыць неабходную эканамічную базу. Для таго, каб мець грошы, патрэбна ўлада.

Кульмінацыяй маёй дыскусіі з юрыстамі стала размова з Янам Фунгам,— хадзячай юрыдычнай энцыклапедыяй. Ён вызначаецца арыгінальнасцю мыслення з аднаго боку і выдатнай аргументацыяй — з другога.

Шмат цікавых і карысных меркаванняў выказаў Ян, і каб хоць крыху вычарпаць запас яго думак і прапаноў, патрэбна вялікая прэс-канферэнцыя.

«...Спакой нам толькі сніцца»

Пабываць адразу на пасяджэннях усіх секцый я не магла. Наведала толькі вучобу намеснікаў сакратароў камітэта камсамола па ідэалогіі. Дзе яшчэ даведаешся пра ўсе нюансы перадвыбарнай барацьбы, як не на пасяджэнні ідэалагічнага сектара. «Галоўным» тут студэнт IV курса юрфака І. Верхаводка. Прынцып работы Ігара даволі просты: ён збірае вакол сябе зацікаўленых людзей — поўная адсутнасць прымусоўкі. Пакуль яшчэ не прыдумалі канчатковай назвы ідэалагічнаму сектару камітэта камсамола. Існуе думка, што гэта будзе цэнтр палітычнага рэагавання, асноўнымі напрамкамі дзейнасці якога стане арганізацыя клуба выбаршчыкаў і клуба палітычнага «лікбеза». Задача першага — распрацоўка стратэгіі і тактыкі выбарнай барацьбы, стварэнне палітычнай платформы выбіраемага і яго вылучэнне ў мясцовыя Саветы народных дэпутатаў. Другі клуб — гэта арганізацыя сустрэч з палітычнымі, рэлігійнымі, культурнымі дзеячамі.

Хапіла нявырашаных пытанняў і ў сакратароў камсамольскіх арганізацый факультэтаў. Кожны дзень — гэта новая праблема, новая сітуацыя і, зразумела, новае рашэнне.

Так што самі бачыце, суботні дзень у ММЦ «Юнацтва», быў надзвычай цяжкім і ўсё ж удалым, шматабяцаючым. Мэты высветлены, задачы вызначаны, справа ў дзеяннях!

Ад рэдакцыі камсамольскую вучобу праходзіла
Інга ШЭЛЕПАВА.

ДА 500-ГОДДЗЯ Ф. СКАРЫНЫ

«В СИХ КНИГАХ ОБРАЗЦИ...»

«Гравюры ў яго выданнях,— сцвярджае беларускі скульптар З. І. Азгур,— вельмі «кніжныя», яны цудоўна кладуцца ў тэкст, носяць высокапрафесійны характар. Іх адрознівае пераканаўчы малюнак, тонкі, прыгожы штрых, які па-майстэрску падкрэслівае тэхналогію працэсу стварэння гравюры».

У пражскіх выданнях Скарыны змешчаны 45 ілюстрацый, надрукаваных з 38 дошак метадам гравюры на дрэве. Мастацкае аздабленне іх дапаўняюць 22 вялікія застаўкі, нямала дэкаратыўных віньетак, 766 прыгожых літарак-ініцыялаў — «за каждою кафисмою заставица большая, а по каждой славе заставица меньшая для лепшего разделения чтущим положены суть».

Францыск Скарына добра разумеў значэнне ілюстрацый у працэсе навучання — для нагляднага знаёмства з тымі рэчамі, будынкамі, з'явамі, пра якія ідзе гаворка — «кто бы так межы простыми людьми братии моей хотел ясней разумети, яковым обычаем был храм уцелан, кивот, стол, светильник, требник и ризы жреческие, тое все вымалеванное нижей знайдеть».

САКРЭТ ФІРМЫ

АКЦЁРЫ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

Вы не хацелі б перавесціся са свайго факультэта на акцёрскі, не выходзячы за межы роднага універсітэта?

Разумею ваша жаданне. Але ажыццявіць такую мару могуць пакуль толькі студэнты аднаго універсітэта нашай краіны — Чачэна-Інгушскага. Тут адкрыта акцёрскае аддзяленне.

Такі смелы крок (за спецыфічную справу ўзяліся!) кіраўнікоў гэтага ВНУ — лагічны працяг усяго, што робяць яны зараз разам з супрацоўнікамі, выкладчыкамі і студэнтамі, каб ператварыць сваю альма-матэр у цэнтр па адраджэнню нацыянальнай культуры, мовы, гісторыі.

Праблема недахопу акцёраў у нацыянальных тэатрах даўно стала паўсюднай. Калісьці ў Маскве, Ленінградзе і Варонежы былі адкрыты спецыяльныя нацыянальныя студыі. Але нацыянальная мова там ці наогул не выкладалася, ці выкладалася вельмі павярхоўна. Да таго ж, студэнты, якія навучаюцца па-за межамі сваёй рэспублікі, у нейкай меры адарваныя ад нацыянальнага мастацтва і літаратуры.

Чачэна-Інгушскі універсітэт будзе першай ластаўкай. Яе крылам пакуль не перашкаджаюць: метадычнае кіраўніцтва акцёрскім аддзяленнем будзе ажыццяўляць Ленінградскі інстытут тэатра, музыкі і кінематаграфіі, спецыяльныя дысцыпліны будуць выкладаць вопытныя і вядомыя майстры сцэны, а мову — кампетэнтныя філолагі.

С. БЕРДУКАЕЎ.

АЎТАГОЛ

Для каго гуляем?

Пытаецца, у прыватнасці, трэцякурснік факультэта журналістыкі Сяргей Лаўнік. Ён лічыць, што:

— Першынство універсітэта па футболу прайшло на добрым узроўні. Але цікава, для каго праводзяцца такія спаборніцтвы? Ва ўсе часы футбол (ды і іншыя віды спорту) быў прызначаны для балельшчыкаў. А зараз? Балеем самі за сябе? Чаму мы даведваліся аб правядзенні спаборніцтваў па чутках? І яшчэ адно выклікае непаразуменне: хто складаў расклад сустрэч і чаму выбраў адзінаццаць—дванаццаць гадзін — у гэты ж час ідуць заняткі? Магчыма, арганізацыйны камітэт спаборніцтваў і іх галоўны суддзя В. Д. Ліштван адкажуць на пытанні?

А вось думка Віталя Данілавіча Ліштвана:

— Мы не ставілі сваёй задачай назбіраць як мага больш гледачоў — гэта не абавязкова. Галоўнае, што самі спаборніцтвы былі масавымі — у іх прыняло ўдзел больш за сто чалавек. Таму лічу, што нягледзячы на некаторыя невялікія накладкі, турнір удаўся.

Сапраўды, на гэты раз «каэфіцыент удзелу» быў даволі высокі. Дванаццаць камандзмагаліся за права быць першымі сярод факультэтаў. Але званне лідэра заўсёды атрымлівае мацнейшы. Пераможцай стала каманда фізічнага факультэта, другое месца — у радыёфізікаў, трэцяе і чацвёртае — адпаведна ў юрыстаў і журналістаў.

Няма патрэбы падрабязна апісваць усе гульні. Варта адзначыць, што тактычна цікавую гульню дэманстравалі студэнты фізічнага факультэта і радыёфізікі. Нядрэнна папрацавалі хлопцы з факультэта журналістыкі, каманда якіх узмацнілася, дзякуючы другакурснікам С. Арлоўскаму, І. Чарткову, В. Цыганкову, якія нядаўна вярнуліся з арміі і зноў пачалі гульню. А варатар журналістаў Ягор Хрусталёў, атрымаўшы траўму, паранейшаму абараняў «апошні рубеж» каманды.

І ўсё ж такі хацелася, каб гульні спартсменаў бачылі іх таварышы і змаглі хаця б маральна падтрымаць у складаны момант. Давайце не будзем лічыць пустыя трыбуны «невялікімі накладкамі».

А. СІВЫ,
студэнт факультэта журналістыкі.



ПРАЗ РАСЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ

Чай па-руску

І вы таксама здзівіліся б, пачуўшы вершы С. Маршака, Р. Раждественскага, якія чыталіся часам з вельмі заўважным акцэнтам. Іх дэкламавалі замежныя студэнты. І не бяда, што цяжка вымавіць па-руску тое ці іншае слова,— яны яшчэ толькі вучацца мове Леніна. І тут, на вечары «Рускі чай», таксама. «Нават калі мы маўчым, мы маўчым па-руску»,— заўважыў адзін з замежнікаў.

...На сталах — нашы «фірменныя» стравы, у перапынках гучыць музыка рускіх кампазітараў, а сябры побач — у нацыянальных касцюмах. І па-руску шчырыя, гасцінныя гаспадыні вечара.

Пакой напаўняюць песні рускіх кампазітараў у выкананні лаўрэата Усесаюзнага конкурсу мастацкай самадзейнасці Ранару Вахуока і дыпламанта універсітэцкага фестывалю Ларэнса Мейсес Гальван. Горача апладыравалі прысутныя і студэнтам з ГДР, якія выконвалі беларускія народныя песні. Кожнаму прыемна было ўсведамляць, што замежныя студэнты цікавяцца не толькі рускай культурай, але і беларускім фальклорам.

Ветлівыя гаспадары і гаспадыні ўважліва сачылі, каб госці не сумавалі і частаваліся чаем і ласункамі, што былі на сталах. Дарэчы, кожны з іх меў сваю назву: «Кацюша», «Сузор'е сяброў» і «Самавар». Ды яшчэ і конкурс аб'явілі на самы актыўны стол. На працягу яго замежныя студэнты паказалі добрыя веды па гісторыі СССР і БССР, горада Мінска. Нарэшце, вынікі падведзены. Перамог стол «Кацюша». Яго гаспадары і госці атрымалі ўзнагароды. Не засталіся пакрыўджанымі і ўсе астатнія ўдзельнікі вечара — іх таксама чакалі сувеніры.

А. СУХАВЕРХІ,
Р. ЛЯВІЦКІ,
студэнты факультэта журналістыкі.

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

«Усе ганарацца мной»

Не так даўно я развітаўся з выкладчыкамі, сябрамі, знаёмымі, якіх сустрэў у Беларускім універсітэце. Безумоўна, сумна пакідаць Мінск, але больш моцным было жаданне ўбачыцца з роднымі. Як радасна яны сустрэлі мяне! Мае бацькі вельмі задаволены і ганарацца тым, што я атрымаў дыплом у Савецкім Саюзе. Яшчэ б: я вучыўся ў Краіне Саветаў! Я жыў сярод савецкіх людзей, а многія з іх сталі маімі сябрамі.

Што датычыць работы, то нядаўна я атрымаў запрашэнне дырэктара Інстытута рускай мовы імя А. С. Пушкіна ў Рускім культурным цэнтры пры пасольстве СССР у Браззавілі. Мне прапанавалі даваць урокі рускай мовы першакурснікам. Не ведаю, ці згаджацца: я ж мяркую вярнуцца да вас у аспірантуру. Вядома, практыка яшчэ нікому не шкодзіла, не была б яна лішняй і для мяне. Але не хочацца адкладваць і паездку ў Мінск. Думаю, мяне яшчэ не забылі на кафедры агульнага і славянскага моўзнаўства. А пакуль — да сустрэчы!

АНДОНГА ГАСТОН,
выпускнік філалагічнага факультэта.
(Народная Рэспубліка Конга).

УРАЖАННІ СТАРОННЯГА ЧАЛАВЕКА

Трапіць у госці да сяброў, што жывуць у інтэрнаце, магчыма, не менш складана, чым выехаць за мяжу. Доўга пераконваю вахцёра, што «пранікаю» з самымі благімі намерамі: іду проста ў госці.

Не надта ўзнімаецца настрой і ў пакоі маіх знаёмых. Чатыры ложкі стаяць так шчыльна, што тумбачкі могуць прыстасавацца толькі ў чатыры паверхі. Стол сумяшчае абавязкі пісьмовага з куханным ды яшчэ дае прытулак тэлевізару. «У цеснаце — не ў крыўдзе»,— узбадзёрваю сябе я. Інтэрнацкае жыццё заўсёды здавалася мне суцэльным святам непаслухмянасці. Вось дзе сапраўдная воля, цікавае і вясёлае жыццё. Словам, «Гаўдэамус ігітур»...

Але высветлілася: не надта «свабодна ў гэтай свабодзе» і наогул нецікава. З усіх падзей культурнага жыцця запомніліся толькі Каляды, якія некалькі гадоў запар праводзіліся ў інтэрнаце на Новы год. Цікавасць да дыскусійных сустрэч амаль «нулявая», тэмы не вельмі прываблівалі. Паходаў не робім. Бывае выпадкова ў тэатр, на выстаўку ці ў філармонію зазірнем, але ж гэта для студэнта раскоша. Сустрэчы з цікавымі людзьмі ў інтэрнаце — з'ява ўнікальная і, безумоўна, рэдкая. Так і праходзіць студэнцкае жыццё: усплёск цікавага і захапляючага, а потым пустая трата часу, працяглыя перакуры на балконах ці лесвічных пляцоўках. Застаецца яшчэ вучоба, бібліятэка, напрыклад. Аднак не вучобай жа адзінай дыхае студэнт.

Сумна жыць у гэтым (самі здагадаецеся, якім) інтэрнаце, панове і паненкі. Заўтра зноў заняткі, а пасля...

Т. ЗАГНІЙ,
выпускніца.

ЗАВОЧНАЯ ШКОЛА СТЭНАГРАФІІ

ПА ЗАКАЗУ ГАЛОСНАЙ Е

(Заняткі пачаліся ў № 28).

Калі мы раздзялялі знакі на розныя групы, галоўнымі прыкметамі былі вышыня знакаў ці іх напісанне. Але літары Л і Д склалі групы па новай прыкмеце, у залежнасці ад таго, дзе пачынаюцца знакі.

Літара Д — двухмерная, аднак пачынаецца там, дзе аднамерныя знакі Т і К, на ўзроўні кантрольнай лініі. Таму Д і стала побач з імі. А літара Л далучылася да малых: усе яны пачынаюцца паміж асноўнай і кантрольнай лініямі.

Сфарміраваны гэтыя групы па заказу галоснай Е. Пры такой пабудове лягчэй адпрацаваць спалучэнне галоснай з зычнымі ў пачатку слоў:



У першай групе поўнае ўзаемаразуменне: зычныя пачынаюцца якраз на тым узроўні, дзе заканчваюцца галосныя.

У наступнай групе зычныя пачынаюцца вышэй, чым хацелася б. Галоснай даводзіцца падстройвацца пад іх. Каб галосная заканчвалася на ўзроўні кантрольнай лініі, яна павінна пачынацца на паўмеры вышэй за асноўную:



Аднак будзем лічыць дапушчальным і напісанне галоснай ад асноўнай лініі:

У трэцяй групе будзем пачынаць галосную ад кантрольнай лініі ці на паўмеры вышэй за яе. І ў адным, і ў другім выпадку будзе правільна:







Практыкаванне: Еле едем. Дети ели кекс. Мы едем в лес. В селе ели. В эти месяцы. Эволюция и медицина. В эти сети плыли сельди. Эти планы.

Урок вёў
Уладзіслаў ГЕРАСІМАЎ.

НЕ ПА ЧУТКАХ

Спачатку ён імкнуўся ўгору, гэты адчайны грамадзянін. Крок за крокам прасоўваў перад сабой велізарны камень судакранання, на які доўгі час нагрувашчваліся адна за другой студэнцкія праблемы: прынцып астаткавага фінансавання ВНУ, сельгасработы, нізкі ўзровень выкладання грамадскіх навук, мёртванароджанае дзіця — самакіраванне... Ён непахісна верыў, што цяжкай працай сваёй пераадольвае самую запушчаную хваробу — шматгадовае занядбанне інтэлектуальнай аэліты, эканоміі на навучанні, у выніку чаго з трэцяга месца ў свеце па інтэлектуалізацыі моладзі (50-я гады) краіна пераскочыла на сорак другое ў васьмідзесятых. Ён шукаў і шукаў рэзервы. Ну, зусім, як сучасная вышэйшая школа.

Насустрач ляцеў на «Скэйце» бесклапотны і ўсмешлівы чалавечак. Надта ўжо на папярэдняга не падобны, калі б той быў пазбаўлены цяжару.

Што сімвалізуе гэты плакат, змешчаны ў першы дзень форума ў «Комсомолке»? Сапраўднае вызваленне, падараванае вышэйшай школе? А можа легкадумнасць, з якой пакуль большасць з нас адмаўляецца ад дасягнутага? Ці безвыніковую працу і бессэнсоўнае вяртанне Сізіфа?

Разважае дэлегат Усесаюзнага студэнцкага форума, студэнт юрыдычнага факультэта Уладзімір ХВАЛЕЙ.

ДАВЕДКА

Першы агульнастудэнцкі з'езд у Расіі адбыўся летам 1900 года ў Адэсе... Усе дэлегаты былі арыштаваны паліцыяй.

Другі агульнастудэнцкі з'езд прайшоў у Рызе ў 1902 годзе. Ён абраў за мэту — звяржэнне царызму.

— Ці спадзяваўся я на прадукцыйнасць форума?

Форум — сход, дзе можна мітынгаваць і спрачацца, прымаць рэзалюцыі, якія б выражалі меркаванні студэнцтва, і ўздзейнічаць на грамадскую думку. Але ні адно з яго рашэнняў не будзе мець юрыдычнай сілы, пакуль іх не зацвердзяць адпаведныя дзяржаўныя органы, якія і самі інфармаваны не горш за студэнтаў і, відавочна, рыхтуюць пакет прапаноў і канкрэтных мер па паляпшэнню якасці навучання. Папраўкі дэлегатаў, магчыма, улічаць пры распрацоўцы дакументаў. Праўда, не верыцца, каб форум кардынальна нешта змяніў.

СПЫТАЕМ У МІНІСТРА

«Сённяшняе абмеркаванне працэдуры больш нагадвае дрэнную аперэтку. Гэта ж усяго толькі гульня ў сур'ёзную палітыку, у З'езд народных дэпутатаў, напрыклад».

Старшыня Дзяржкамітэта па народнай адукацыі Г. А. ЯГАДЗІН.

— Імітаванне З'езда народных дэпутатаў праяўлялася даволі акрэслена. У знешнім капіраванні. Адзін адчуваў сябе Сабчаком, іншы — Абалкіным. Пераймалі форму выказванняў па тых ці іншых пытаннях, але змест выступленняў далёка стаяў ад з'ездаўскіх.

Не было прыярытэтаў — іграючы ў Сесію Вярхоўнага Савета, многія ў той жа час проста не ўяўлялі, за што трэба змагацца ў першую чаргу і пачыналі корпацца ў дробязях, якія нічога не вырашалі. Скажам, распрацавала беларуская дэлегацыя палажэнне аб асобным меркаванні — прапанове, якую не прыняла большасць, але падтрымала трэць дэлегатаў. І калі нехта ўзняў пытанне аб тым, каб зафіксаваць у якасці асобнага меркаванне па працэдурных пытаннях і складу рэдакцыйнай камісіі, гэта выглядала недарэчным.

ПАВЕДАМЛЯЕ ПРЭСА

«Зала бушавала, кіпела, пенілася. Ніхто не слухаў астатніх. Многія імкнуліся да мікрафона толькі для таго, каб абвясціць тое, што прагучала... пяць хвілін назад. Калі сумленна, у нейкае імгненне мне падалося, што форум намертва забуксаваў».

«Комсомольская правда», 17.10.89.

— Гэта ў сераду, у першы дзень работы, які пачаўся вельмі неардынарна. Як толькі на сцэне з'явіўся прэзідыум, адзін з дэлегатаў заклікаў усіх ушанаваць мінутай маўчання памяць кітайскіх і ўсіх студэнтаў, загінуўшых у барацьбе за дэмакратычныя пераўтварэнні. Гэтага не чакалі. Зала аднадушна ўстала.

Першы дзень я падзяліў бы на дзве часткі. Спачатку было выступленне Міхаіла Сяргеевіча Гарбачова і прэс-канферэнцыя. Была апаска, што першае пленарнае пасяджэнне з вырашэннем арганізацыйных пытанняў так і не адбудзецца. Здавалася, дэлегаты забыліся, навошта сюды прыехалі, і жадалі толькі задаваць пытанні і выслухоўваць адказы. Нарэшце, знайшоўся чалавек з разважлівым розумам, які перарваў: хопіць.

З гэтай хвіліны пачалася другая частка пад назвай «хаос». Разам з тым, што 51 працэнт дэлегатаў быў настроены змагацца толькі за свае пазіцыі, многія страцілі давер да Падрыхтоўчага камітэта, сфарміраванага ЦК ВЛКСМ. І хоць 120 чалавек (пры агульнай колькасці 1500 дэлегатаў) асаблівай ролі не адыгрываюць, доўга вырашалі пытанне аб прадастаўленні членам ПК статуса дэлегатаў.

Абмяркоўваючы парадак дня, засяроджвалі ўвагу на другарадных, непатрэбных пытаннях. Не гаворачы ўжо пра тое, што выступаючыя адмаўляліся слухаць адзін аднаго. У восем гадзін, здаецца, на апошнім дыханні прынялі пакет дакументаў.

На другі дзень дэлегаты вялі сябе больш разумна. Высветлілі прыярытэты, усвядомілі пазіцыі.

ЦІ СПРАЎДЖВАЮЦЦА ПРАГНОЗЫ?

«Мяркуючы па ўсяму, найвялікшай папулярнасцю будуць карыстацца два цэнтры: «Студэнт і грамадска-палітычныя праблемы грамадства» і «Студэнцкі рух».

«Смена», 17.11.89.

— Спачатку, выконваючы абавязак перад выбаршчыкамі, я накіраваўся ў дыскусійны цэнтр «Студэцкі рух». Я спадзяваўся, што адзінае рашэнне, на якое мае паўнамоцтва форум,— аб арганізацыйным афармленні студэнцкага руху, усё ж будзе прынята. І памыліўся. Немагчымасць стварэння студэнцкай арганізацыі была прадвызначана адразу. Таму што не існавала адзінага пункту гледжання на тое, якая гэта павінна быць арганізацыя (налічвалася каля 10 платформ). У такім выпадку нават калі б атрымалася запэўніць у правільнасці сваёй думкі 200 удзельнікаў цэнтра, перакананць 1500 дэлегатаў было немагчыма. Як і атрымалася на Рэспубліканскім форуме: на пленарным пасяджэнні нашу ідэю, што перамагла ў дыскусійным цэнтры, зарубілі, нават не ўнікаючы ў нюансы.

Многія перасцерагаліся ад таго, каб, згадзіўшыся з ідэяй, не расставіць уласнымі рукамі крэслы для новых функцыянераў. Да таго ж, кіруючы цэнтр павінен быў знаходзіцца ў Маскве, а маскоўская «міжрэгіянальная група дэлегатаў» сярод удзельнікаў форума не карысталася павагай. Сышліся на стварэнні інфармацыйна-кардынацыйнага аддзела — хто валодае інфармацыяй, той пануе над сітуацыяй.

А дыскусійны цэнтр «Студэнт і грамадска-палітычныя праблемы грамадства», у якім я таксама прымаў удзел, распрацаваў «Палітычную дэкларацыю» і шматлікую колькасць рэзалюцый. Апошнія, на жаль, на заключным пленарным пасяджэнні нават не абмяркоўваліся.

НАША ЎЗЯЛО!

Міністэрства грамадзянскай авіяцыі СССР устанавіла ільготны праезд для студэнтаў і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных устаноў на ўнутраных паветраных лініях з 15 снежня 1989 года па 15 сакавіка 1990.

— На што студэнт можа яшчэ спадзявацца пасля форума? На стварэнне міжвузаўскіх інтэрнатаў для студэнцкіх сем'яў. На тое, што са студэнцкіх даходаў (стыпендыя, прэмія) не будзе збіравацца падатак, а студэнцкія кааператывы атрымаюць права на ільготнае абкладанне падаткамі.

Мы патрабавалі права на добраахвотнае наведванне «ваенкі» усім тым, хто адслужыў у войску, дэідэалагізацыі ўсіх грамадскіх навук, аўтаноміі ВНУ (самастойнасці быць не можа, пакуль навучальная ўстанова эканамічна залежыць ад дзяржавы). Мы патрабавалі, бо больш нічога не маглі.

САЦЫЯЛАГІ СВЕДЧАЦЬ

747 дэлегатам форума задалі немудрагелістае пытанне: «Ці застаецца студэнцтва па-ранейшаму пасіўнай масай?» Вынік: новую ролю студэнтаў усвядомілі толькі 11 працэнтаў дэлегатаў. Каля 85 працэнтаў лічаць, што месца студэнтаў у перабудове не змянілася. Але хітрэй за ўсіх паступілі 4 працэнты дэлегатаў, якія на пытанне сацыяёлагаў няўпэўнена адказалі: «Не ведаю».

— Калі сумленна, форум не стаў той зоркай, да якой трэба было імкнуцца праз церні перадвыбарнай барацьбы. Не толькі я быў ашаломлены і расчараваны. Дэлегаты студэнцкай канферэнцыі ва універсітэце па ўзроўню палітычнай культуры былі намнога вышэй за некаторых дэлегатаў форума. Туды трапіла шмат выпадковых людзей. І ў тым, што так і не ажыццявілася мара аб стварэнні студэнцкай арганізацыі ў краіне, павінна яшчэ і агульная пасіўнасць студэнцтва, нежаданне змагацца за свае правы. Мы перажываем духоўны крызіс. Мы не верым ні ў што, бо ведаем: працуй ці лайдач — нічога не зменіцца.

Запісала
З. МАРАВА.

Фотакалаж С. ГРЫЦА.

МАСТАЦКАЯ ГАСЦІНАЯ

НАША АГУЛЬНАЯ БЯДА

...І дзівіцца на астатняе

Гэта выстаўка яшчэ працуе. Хачу вярнуцца сюды, выдзяліўшы гадзіны дзве наплыву ўспамінаў, асацыяцый, мар і — болю.

Боль адчуваецца ўжо ў назве выстаўкі — «Мастак і экалогія». Не Зямля, не Прырода, а экалогія. Нейкае сумнае слова.

Вам не патрэбны гэты газетны матэрыял, каб прыйсці сюды. Не буду называць ніводнага твора з вялікай экспазіцыі. У вас будуць СВАЕ творы тут. Вы затрымаецеся ля іншых работ, абмінеце не тыя, якія толькі што абмінуў нехта іншы. Цудоўна, што здолееце і абмінуць, і затрымацца!

Словам «Чарнобыль» тут прасякнута ўсё. Не, не словам. Гэта ж ужо амаль што філасофская катэгорыя. Над яе разгадкай ваш розум будзе працаваць увесь час, пакуль вы будзеце хадзіць па залах Палаца мастацтваў. Паспрабуеце пакінуць яго на хвіліну — паглядзіце ў вялізныя вокны — і зноў, ужо міжволі, вернецеся да тых жа думак. Вось ён, натоўп каля праспекта. Што купілі гэтыя людзі ў доўгіх чэргах? Колькі яшчэ атруты цягнуць у свае кватэры, сваім дзецям у тых цяжкіх торбах? Якое паветра бяруць яны ў лёгкія, калі цяжка ўздыхаюць ад горкіх думак ці радасна вітаюць старых знаёмых?

Вы зноў у зале. Прыгледзьцеся вось да гэтага пейзажу. Памятаеце, калісьці вы адчулі нешта падобнае сярод летняй прасторы, абдымаючыся з небам, лесам і з радасцю адначасова? Тады вырашылі, што некалі перадасце свае пачуцці самаму-самаму дарагому чалавеку. Калі атрымаецца. Прыйшлі на выстаўку і ўбачылі: атрымалася! Але не ў вас, а ў зусім незнаёмага мастака...

Экскурсавод заклікае наведвальнікаў не толькі аддавацца жаху таго, што здарылася ў красавіку 1986 года, але і дзівіцца на тое, што захавалася. І тую, і другую магчымасць выстаўка прадастаўляе нам.

Адзін твор усё ж назаву, бо ўпэўнена, што большасць людзей спыніцца каля яго. «Пчолы бароняць вулляў сваіх». Гэта таксама пра Чарнобыль. Прама на палатне — літары, яны паведамляюць, што пасля аварыі на чацвёртым блоку з яго рэактара выкінута ў паветра каля 63 кілаграмаў высокарадыёактыўных рэчываў. А пасля ядзернага выбуху над Хірасімай — 740 грамаў.

63 кілаграмы не перамаглі, і нашы вуллі жывыя. Пакуль мы здольныя абараніць і захаваць іх. Няхай выстаўка дае нам усім сілы на гэту вечную добрую справу!

В. СВЕЧЫНА.

Сёння мы запрашаем вас у «Мастацкую гасціную» на выхадныя дні. Калі яны ёсць у вас. Дарэчы, ці натуральна выглядае чалавек, які аддае ўвесь час рабоце? Хутчэй, толькі той здольны прыгожа рабіць справу, хто ўмее на час забыцца на яе і паўнацэнна адпачыць.

Можа, гэта ўжо стэрэатып — што адпачынак павінен быць звязаны з мастацтвам. Можа, заштампавалася і наша звычка лічыць сустрэчы з ім адпачынкам. Няхай кожны вырашыць гэта для сябе сам. Але ўспомніце свой апошні выхадны, спытайце, як правялі яго вашы знаёмыя, і атрымаецца адно: клопаты, клопаты, клопаты... Пасля іх засілля нават самы складаны твор мастацтва здасца вам прымітыўным, або наогул не будзе ўспрымацца.

А як было цудоўна без гэтых клопатаў у дзяцінстве! Не зведаць нам зноў тую бестурботнасць. Але чаму ж хоць зрэдку не вяртаць сабе дзіцячыя пачуцці?

Заходзьце ў нашу гасціную з надзеяй зрабіць свае наступныя выхадныя больш цікавымі і насычанымі. Няхай надзея не пакіне вас і пасля таго, як прачытаеце гэту старонку. Бо па-за ўвагай размовы застаецца столькі цікавага і новага!

У СПОРТКОМПЛЕКСЕ — КАНЦЭРТ

З падзякай гандболу

Як здорава ехаць у бясплатным аўтобусе, калі за вокнамі кружыць снег! Нічога, што ўвесь час піхаюць у спіну і адціснулі правую нагу. Затое чырвоныя літары на лабавым шкле «ЮРЫЙ ЛАЗА» клічуць у спорткомплекс «Уручча».

Вось і прыехалі! Дзякуй, усе грузікі на месцы. Прабіраемся праз КПП, дзе, між іншым, можна ўсміхнуцца Савецкай Арміі. Напарадзе — канцэрт!

Але ж куды мы трапілі? Неяк цяжка зразумець, што нас тут чакае: захапляючае гандбольнае спаборніцтва ці... няўжо сустрэча з мастацтвам? Вось «прашамацеў» хлопец у спартыўным касцюме майстра спорту, а дзяўчына з паходкай манекеншчыцы спыніла агульную ўвагу сваім вячэрнім туалетам, падобным на падарунак самой Энне Бурды.

Перакідваючы сваё адзенне праз натоўп у гардэробе, мы падрыхтаваліся да сустрэчы з залай. Тут сапраўды так і хочацца скокнуць увышыню ці прабегчы стометроўку. Нам на другі рад! Будзем сядзець каля сцэны, разгледзім усе падрабязнасці адзення артыстаў, амаль дакрануцца да іх зможам. Не, так не атрымалася, бо другі рад, аказалася, знаходзіцца на адлегласці звычайнага шостага. Нічога не зробіш, што-небудзь пабачым. Не садзіцца ж у сектары, калі аддаў за білет 5 рублёў.

Спачатку, як звычайна, канферанс'е. Але сёння ён не спрабуе парадыраваць нашага палітычнага лідэра і наогул «кан'юнктурнічае» мала.

Цэнтральная асоба канцэрта Юрый Лаза добрасумленна «адпрацаваў» свае 14 песень. Акрамя таго, шмат расказваў пра нябачныя бакі сваёй творчасці і жартаваў — што не магло не спадабацца гледачам. З удзячнасцю пакідалі канцэрт нават тыя, хто не ўспрымаў новае сцэнічнае амплуа Лазы, памятаючы рэпертуар яго «Прымуса».

У сэрцы доўга гучала: «На маленьком плоту...» — хоць вярталіся мы зноў у цеснаце бясплатнага аўтобуса...

Н. МАРТЫНЕНКА.

ІНТЭРВ'Ю-СПОВЕДЗЬ

— Вас, пэўна, усё жыццё крытыкавалі за ваш спосаб існавання. А ці разумее хто-небудзь?

— Дамаседа лепш за ўсіх зразумее дамасед. Але не кожны: той, хто любіць заставацца дома, каб суткідругія паспаць,— паспачувае такому, як сам. Я не такі, і любы чалавек, здаецца, павінен зразумець. Магу растлумачыць, чаму...

— Не, скажыце лепш, ці быў у вас калі-небудзь іншы лад жыцця?

— А як жа! Я некалі займаўся на курсах англійскай мовы і разам з усімі рыхтаваў тэму «Мой вольны дзень». Вось яе змест і паказваў мяне як вельмі рухавую асобу. Слухаючы мяне, можна было ўявіць: я толькі і раблю, што імкнуся сыходзіць з дому.

— Мне ўсё ж незразумелы ваш гонар, які адчуваецца ў словах пра дамаседства. Хіба цікавае ваша жыццё? У іншых выхадныя дні — заўсёды падзея, бо ёсць новыя ўражанні. А ў вас? Знаёмае крэсла, знаёмыя хатнія тапачкі, адны і тыя ж твары...

— Наадварот. Разумееце, у мяне кожны дзень — як кавалачак уік-энда. Калі скончылася дзённая бегатня, ты вяртаешся дадому і можаш дазволіць сабе сёння не займацца хатнімі справамі — твая кватэра раптам ператвараецца ў духоўнае прыстанішча. Нават калі ўсесціся перад тэлеэкранам — не разумею, чаму гэта лічыцца заняткам гультаёў. Калі глядзіш, напрыклад, добры фільм даўно мінулых гадоў — сэрца так напружана працуе, такое ачышчэнне адбываецца!

Не гаворачы ўжо пра «інтэлектуальнае» кіно, зараз жа нават Таркоўскага можна паглядзець па тэлебачанню. Да таго ж, за апошні час з'явілася цэлая галерэя перадач, у час якіх не за шклянкай чаю бяжыш на кухню, а неадрыўна сядзіш перад тэлевізарам і гэтак жа неадрыўна думаеш.

Можаце прыбавіць да гэтага багацця яшчэ і тое, якое штодзённа, кожны раз новае, прыносіць паштовая скрыня.

— Усё гэта сапраўды цудоўна. Але ж паўтараецца бясконца. Няўжо не стамляе вас такая аднастайнасць вашых заняткаў?

— Вы нават не ўяўляеце сабе, як многа іх пакуль застаецца незнаёмымі для мяне! Вунь на кніжных паліцах стаяць розныя энцыклапедыі. Даўно хачу ўзяцца за якую-небудзь з іх і ўдумліва прачытаць ад коркі да коркі, потым перайсці да наступнай... Яшчэ адна даўняя мара — перачытаць самае значнае з літаратурнай класікі. Дакладней будзе назваць гэта не перачытваннем, а першым чытаннем, бо тое, як даносілі гэту класіку да нас у школе, ужо даўно згубілася сярод усяго новага, што атрымаў за гэты час розум.

Ведаеце, як яшчэ цікава праводзіць час? Сесці ля любімага акна, калі настрой спрыяе гэтаму, і, прабачце за трывіяльнасць, падумаць аб жыцці. У такія хвіліны мяне наведваюць цікавыя думкі. Такая, напрыклад: чаму мы лічым, што птушкі ляцяць на поўдзень, пакідаючы тут свой дом? Можа, іх дом як раз там, на поўдні, а да нас яны прылятаюць «у госці»...

А часам проста гляджу на падаючы снег і шкадую: вось яна, прама з неба ляціць да нас яшчэ адна магчымасць ачысціцца. Але снег, як заўсёды, хутка стане брудным...

Скажыце, няўжо вам не падабаецца аднойчы знайсці ў стале свае старыя паперы: пісьмы, асабістыя запісы. Перагледзець іх зноў, і быццам нябачнай лінейкай адмераць: падрос ты за гэты час душой сваёй ці, наадварот, стаў ніжэй. Губляецца ж нешта з бегам жыцця, як у таго снега: пачарнеў ён, пачаў раставаць — дык гэта ж да вясны, але чысціні былой няма...

— Мне здаецца, я пачынаю вас разумець... І ўсё ж скажыце, калі ласка: хоць зрэдку вам хочацца «на людзі»?

— Безумоўна! У гэтым я таксама адчуваю сябе багацейшым за тых, у кім пастаянна жыве энергія. Я выходжу з кватэры значна радзей, чым яны. Але калі ўжо выйду... То наведаю самых-самых блізкіх сяброў, а не ўсіх, хто запрашае. Ці праеду ў перапоўненым аўтобусе і тут жа забудуся на яго — бо апынуся ў оперным тэатры і пражыву вечар сярод бясконцага свята...

— Можа, я забыўся ў вас запытаць што-небудзь важнае?

— Дазвольце, апошняе пытанне задам я. Ці згодны вы, што, прачытаўшы маю споведзь, кожны скажа: «Дык гэта ж пра мяне!..»?

—...

Фотакалаж С. ГРЫЦА.

Матэрыялы паласы падрыхтавала **В. БЯГУН.**

РОК-Н-РОЛ «ПА-ІХНЯМУ»

Звар'яцелыя ад музыкі

Канадскім студэнтам падабаецца рок-н-рол. Пытанне ў тым, які менавіта? Музычны кругагляд адных даволі шырокі, іншыя, наадварот, сканцэнтраваны толькі на сваіх захапленнях. «Сканцэнтраваныя» у цэлым могуць быць падзелены на шэраг музычных груповак.

Адна з іх — «ХЭД-БЭНГЕРС» («аматары трэсці галавой»). Іх музыка — аглушальна гучная, з хуткім рытмам і часта мае ў падтэксце выклік. Хэд-бэнгерс ці, як іх яшчэ называюць, «звар'яцелыя на метале» (па назве музыкі «цяжкі метал», якую яны слухаюць), як правіла, носяць доўгія валасы, скураныя куртэчкі і любяць хуткасныя машыны і матацыклы.

Другая група рокераў — панкі. Прычоскі іх нагадваюць дзікіх, экзатычных птушак, знойдзеных у недасягальных раёнах зямлі. Панкі спрабуюць абвергнуць любыя аўтарытэты, якія толькі могуць быць знойдзены ў грамадстве. Таму іх музыка звычайна даволі крытычная ў адносінах да грамадскага ўкладу, які ўсталяваўся ў Паўночнай Амерыцы. Яна таксама гучная, хуткая і агрэсіўная.

Напэўна, большая група слухачоў аддае перавагу папулярнай музыцы, якая ўваходзіць у «Поп-40»,— 40 лепшых песень. Музыка «поп» даволі лёгка слухаецца, пад яе звычайна можна танцаваць, словы не нясуць сур'ёзнага сацыяльнага сэнсу. Гэты тып музыкі пануе на большасці паўночна-амерыканскіх дыскатэк, дзе сталыя наведвальнікі заўсёды апранаюцца надзвычай страката, каб звярнуць на сябе ўвагу такіх жа кідка апранутых прадстаўнікоў супрацьлеглага полу.

Апошняя група, якую мы назавём — арт-рокеры. Гэтыя людзі вельмі ўдумліва ставяцца да таго, што яны слухаюць. Звычайна іх музыка зусім не папулярная, яна хутчэй туманная і незразумелая. Тыя, хто слухае гэту музыку, носяць выключна чорнае адзенне.

Хоць відавочна, што ўсе гэтыя апісанні носяць характар гумарыстычных стэрэатыпаў, але і самі густы маладых канадскіх прыхільнікаў музыкі часта бываюць даволі стэрэатыпнымі. Аднак, нягледзячы на гэта, яны ў той жа час разнастайныя, і ў кожнай групе ёсць што паслухаць.

КЭН ШМАЛЬЦ,
сарэдактар студэнцкай газеты «Гонтліт» (Калгары).

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
14 снежня
Зак. 1640.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.